# Зноў у пераможцах

## Пошукавая і даследчая праца астравецкіх бібліятэкараў адзначана высокай узнагародай

**Дваццаць сёмы раз Нацыянальная бібліятэка Беларусі падвяла вынікі конкурсу «Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры». Астравецкая раённая бібліятэка актыўна ўдзельнічае ў творчым спаборніцтве. Перамога ў 2014 годзе была нечаканай і ганаровай — трэцяе месца ў намінацыі «Навацыі ў галіне бібліятэчнай справы». І вось новае дасягненне: у намінацыі «За пошукавую і даследчую працу» наша кніжніца атрымала трэцюю прэмію.**

Да гэтай перамогі супрацоўнікі аддзела бібліятэчнага маркетынгу ішлі шмат гадоў: ладзілі экспедыцыі, занатоўвалі ўспаміны старажылаў, адшуквалі этнаграфічны матэрыял. У выніку назбіраўся важкі краязнаўчы матэрыял: легенды і паданні, летапісы вёсак, даведкі пра знакамітых людзей, гісторыка-культурныя каштоўнасці і інш. Дарэчы, пазнаёміцца з гэтай інфармацыяй можна на сайце кніжніцы.

Стварэнню грунтоўнай краязнаўчай базы дапамагла гісторыя самой Астравеччыны — менавіта гэта стала галоўнай тэмай конкурснай работы. Дзякуючы маштабнаму энергетычнаму праекту ў краіне — будаўніцтву АЭС — Астравецкі раён імкліва ператвараецца з сельскагаспадарчага ў прамысловы цэнтр з сучасным горадам энергетыкаў і багатай сацыяльна-культурнай інфраструктурай. Плануецца, што насельніцтва горада павялічыцца амаль у тры разы і яго жыхарамі стануць людзі розных нацыянальнасцяў, прафесій, узросту. А з'яднаць іх агульнымі інтарэсамі, даць пачуццё ўтульнага і гасціннага дому могуць многія фактары, у тым ліку і гісторыя астравецкага краю.

Краязнаўчая дзейнасць раённай бібліятэкі разнапланавая: пошук і набыццё дакументаў, іх апрацоўка, алічбоўка, размяшчэнне іх на сайце ўстановы. Ладзім краязнаўчыя экспедыцыі, падчас якіх занатоўваем не толькі расповеды вяскоўцаў, але і запісваем на відэа фальклор, ствараем відэапрэзэнтацыі і слайд-шоу. Працуем над алічбаваннем летапісаў вёсак.

Аснова краязнаўчай дзейнасці — фонд літаратуры, які выдзелены ў бібліятэцы асобна, афармлены кніжныя выстаўкі, ёсць багатая краязнаўчая картатэка, якая адлюстроўвае ў розных аспектах краязнаўчы фонд і матэрыялы з перыядычнага друку.

Краязнаўчая інфармацыя папулярная сярод падрастаючага пакалення. Бібліятэкары праводзяць у трох школах горада краязнаўчыя ўрокі, гадзіны, імпрэзы з удзелам мясцовых пісьменнікаў.




Многія краязнаўчыя матэрыялы знайшлі адлюстраванне ў шэрагу метадычных распрацовак, сцэнарыяў, выдавецкіх буклетаў, створаных супрацоўнікамі аддзела бібліятэчнага маркетынгу. За апошнія тры гады метадысты раённай кніжніцы стварылі два краязнаўчыя буктрэйлеры па творчасці пісьменнікаў-землякоў А. Мальдзіса і А. Цяжкага і электронны рэсурс па творчасці мастака, ураджэнца Астравеччыны А. Драбышэўскага. Усе гэтыя матэрыялы шырока выкарыстоўваюцца настаўнікамі, экскурсаводамі, бібліятэкарамі як дадатковыя веды аб малой радзіме.

Сапраўдным багаццем краязнаўчага фонду бібліятэкі мы лічым работу нашага земляка, супрацоўніка НАН Акадэміі навук Юрыя Унуковіча «Фальклорная спадчына Астравеччыны ў архіве ІМЭФ імя К. Крапівы НАН Беларусі». Кніга вельмі папулярная сярод бібліятэкараў, настаўнікаў гісторыі, музейных работнікаў. У даследаванні навукоўца — каштоўныя звесткі з фальклорных экспедыцый па Астравецкім раёне 1950-х гадах.

Дзевяць легенд, аб'яднаных агульнай тэмай — гідралогія Астравецкага краю, увайшлі ў кнігу «Астравеччына ў легендах», падрыхтаваную ў межах Года малой радзімы да 550-годдзя Астраўца. Выданне стала асноўным з матэрыялаў, дасланых на конкурс «Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры». Тэкст кнігі размясцілі на старонках, якія імітуюць традыцыйны беларускі ручнік, вытканы ў сярэдзіне мінулага стагоддзя.

**Галіна ФРАНЦКЕВІЧ,**
**метадыст аддзела бібліятэчнага маркетынгу Астравецкай раённай бібліятэкі, фота аўтара**